*М.У. МІКУЛІЧ*

# ЛІРЫЧНЫ ГЕРОЙ У ПАЭЗІІ МАКСІМА ТАНКА ДАВЕРАСНЁЎСКАГА ПЕРЫЯДУ

Исследуются характерные особенности поэзии Максима Танка досентябрьского периода; отмечается ее гражданско-патриотическое содержание, связь с актуальными социальными проблемами и противоречиями западнобелорусской действительности, широким народно-освободительным движением, а также возвышенно-романтический пафос, условно-ассоциативная образность.

The article deals with the typical peculiarities of M. Tank's poetry of the period before the September. The author mentions its social and patriotic sense, its connection with actual social problems and contradictions of the West Belarusian reality, with active movement for people's liberty, with elevated and romantic pathos and its associative imaginary.

Максім Танк (Скурко Я.І.) заявіў пра сябе на пачатку 30-х гг. XX ст., яго вершы засведчылі прыход у заходнебеларускую літаратуру надзвычай яркай і самабытнай асобы. У давераснёўскай творчасці паэта пераважаў узвышана-рамантычны характер мастацкага мыслення і абагульнення, яна звяртала на сябе ўвагу ўзрушанасцю светаадчування, прагай жыцця і самасцвярджэння, духоўна-грамадзянскай устурбаванасцю і актыўнасцю. «Першыя кнігі адкрылі ўзнёсла-рамантычную, гераічную прыроду таленту М.Танка» (Гніламёдаў1927, 106).

У 1936 г. выйшаў першы зборнік вершаў М. Танка «На этапах» (адразу канфіскаваны паліцыяй), які сведчыў, што малады аўтар выхоўваўся на трывалых народных духоўна-сацыяльных каштоўнасцях. Творчасць паэта гэтага перыяду характарызавалася высокай ступенню нацыянальна-патрыятычнай свядомасці і грамадзянскай адказнасці, а яго лірычны герой зарыентаваны на адвечныя маральна-этычныя прынцыпы і нормы жыцця працоўнага асяроддзя, багатыя залежы калектыўнага вопыту і традыцый. М. Танк імкнуўся асэнсоўваць з'явы і працэсы заходнебеларускай рэчаіснасці ў іх анталагічным змесце, бачыць іх духоўна-сацыяльную прыроду, асноватворную сутнасць і напоўненасць, перспектывы далейшага развіцця. Духоў-

на-мастацкая свядомасць майстра слова актывізавалася балючай думкай пра зняволены родны край, спакутаваную зямлю, прыгнечаны і занядбаны народ, пра кінутых у змрочныя турэмныя лёхі братоў па змагарнаму руху і падпольніцкай дзейнасці. Глыбокім адчуваннем героікі часу, рамантычнай узвышанасцю драматычнага перажывання, патрыятычнай ахвярнасцю дыхалі многія вершы паэта, напрыклад:

*Хто пачуў тваю песню жапезную,*
*Хто астрожную скаргу пачуў?*
*Беларусь, твае далі бязмежныя*
*Ўскалыхнуць сваёй песняй хачу!*

*Толькі, можа, апець не прыйдзецца*
*Тваю радасць, світання зару, І на*
*польнай на стоптанай сцежцы Пад*
*эскортам закуты памру.*

*Зашуміць, можа, вецер кудлаты*
*З прыдарожнай расстайнай сасны.*
*Не забудзь тады меншаму брату*
*Прынясці паказаць кайданы.* (Танк 1978, 83) Адзначаныя асаблівасці знайшлі сваё развіццё ў наступных зборніках М. Танка - *«Журавінавы* цвет» (1937) і *«Пад мачтай»* (1938). Мастацкі стыль паэта характарызаваўся падкрэсленай ёмістасцю і шматграннасцю зместу: лірыка-апавядальны, падзейна-эпічны пачатак спалучаўся ў ім з рэф-лексіўна-медытатыўным, філасофскім; выкрывальна-сатырычная плынь дапаў-нялася і падсвечвалася прамоўніцка-публіцыстычнай. Многім яго вершам (напрыклад, «Калі няма на свеце маёй мовы...», «У *падзямеллі», «Шэрыя хаты, платы і вароты...», «Лісце каштанаў»)* была ўласціва значная ступень рэалістычнай канкрэтнасці адлюстравання, прадметнай выразнасці жывапіснага малюнка, непасрэднасці і дакладнасці душэўна-псіхалагічнага перажывання. Яны з'яўляліся носьбітамі засяроджанага філасофскага роздуму аўтара, іранічнага высмейвання, ліра-сатырычнага выкрыцця ім апанентаў і непрыяцеляў, крытычна-з'едлівай іскрамётнасці і палемічнага пафасу. М. Танк распрацоўваў кананічны, сабраны і разняволены верш, верлібр, выкарыстоўваў традыцыйныя, добра апрацаваныя шматлікімі папярэднікамі і наватарскія, індывідуальна-аўтарскія сродкі мастацкай выразнасці. Разам з тым у цэлым вядучай у яго творчасці, несумненна, з'яўлялася ўзнёсла-рамантычная стылявая плынь, якая дазваляла яму глыбока і пераканаўча раскрыць свой духоўна-эстэтычны патэнцыял, выявіць ідэйна-маральны змест заходнебеларускай рэчаіснасці, асаблівасці яе вострых праблем і супярэчнасцей.

Паэт здабываў свае «вясняныя» песні з жыватворных крыніц роднай зямлі, снаваў іх з кужалю міготкіх вясёлак і зарніц, лавіў невадам «з рэк нашага краю». «Выцягнуў сетку цяжкую і чую, - казаў ён у вершы "Зноў загарэліся сосны...": - Песня жывая трапечацца ў ціне» (Танк 1978, 348). Якраз Бацькаўшчына-Беларусь, Нарачанскі край, мілая і дарагая душы і сэрцу краса і веліч родных абшараў і краявідаў, жыццё згараванага, але не скоранага працоўнага люду былі крыніцай паэтычнай уражлівасці М. Танка, высокага эмацыянальна-пачуццёвага ладу яго вершаў, іх узрушана-пранікнёнага лірычнага пафасу, бадзёра-ўздымнай энергетыкі. Яны ўплывалі на характар светаўспрымання мастака, абумоўлівалі ўзнёсла-рамантычны, ідэалізаваны ракурс выяўлення працэсаў рэчаіснасці, раскрыцця духоўна-эстэтычнага зместу прыроднага свету.

Духоўна-мастацкі воблік паэзіі М. Танка акрэслівалі экспрэсіўнасць светаадчування, свежасць і вастрыня мыслення, эмацыянальна-пачуццёвая ўсхваляванасць. Яна характарызавалася рамантызаваным выяўленнем суровага

рэалізму часу, падзей і фактаў заходнебеларускага жыцця, духоўна-маральнага свету лірычнага героя. М. Танк імкнуўся да стварэння ўмоўна-рамантычных сюжэтных калізій і сітуацый, насычаных карцін і малюнкаў, яркіх фарбаў і адценняў. Напрыклад, у вершы *«Гэта было, помню, рана-рана...»* ён прыгадваў, як аднойчы *«зазвінеў неспадзявана» «госць вясновы» «Жаўранак у сіняве палёў»,* які быў *«За мяжой, абвітаю смугой// За далёкім золакам барвовым...».* На просьбу паэта расказаць, што ён там убачыў, падзяліцца радасцю, жаўранак *«сыпнуў шчодра»* ў шапку *«Столькі песень, сонца, светлых рос, // Што я ледзь сабраў іх у ахапак // І да хаты бацькаўскай данёс»* (Танк 1978, 43). Цікавы і своеадметны малюнак паўставаў у вершы «Зазімак». Паэт ішоў *«каляінай знаёмай, ІІ Вырваўшыся з-за астрожных муроў»,* і назіраў, як *«Хмары чапляліся за саламяныя стрэхі, за вецер, // Хмары, як згублены вырай»,* як *«Сінія вочы прыжмурыўшы, вечар // Раскручваў зрэбныя трубкі імглы // Па рыжых праталінах жвіру»* (Танк 1978, 44).

Пазнанне рэчаіснасці ў М. Танка было прасякнута рамантычнай чысцінёй духу лірычнага героя, даверлівай шчырасцю ўспрыняцця з'яў і прадметаў, глыбокім пранікненнем у іх духоўна-маральны змест. Яно грунтавалася на акце здзіўлення, працэсе адкрыцця і, як вынік, - душэўнай узрушанасці. Мастацка-вобразныя структуры паэта вызначаліся. такімі асаблівасцямі, як нечаканасць супастаўленняў, суаднясенне розных па свайму характару і маштабу фактаў і працэсаў, кантрастнасць колераў і адценняў, перапад рытміка-інтанацыйнага гучання: *«на вясеннім бруку мокнуць ІІ Ад ліхтароў жывыя плямы»* («Вільня»), *«Дзень залаты ІІ Цёплым сонцам заліты», ІІ матыль «Лётаў, як сон, ІІ Над калоссямі нізка, ІІ Як перазвон, ІІ Над малою калыскай»* («Матыль»), *«Згубяць коні ў вадапоі ІІ Раскаваны маладзік»* («Як задрэмлюць»), *«Хутка пойдуць дзяўчаты грамадою вясёлай, ІІ Каб з крыніцы сцюдзёнай чэрпаць вёдрамі золак»* («Ой, калышацца вецер»), *«Рассыплюць хмары з сініх хустак ІІ Дажджоў сцюдзёную жарству...»,* вецер *«Ў імгле зацягне адысею ІІ З крылатым табарам гусей...»* («Пад мачтай»), *«восень агонь распаліла ІІ З асенняга лісця»* («Каля мора»), *«Зарой прапяялі асверы. ІІ Вясенняя зораў сяўба // Расой ападае на верас»* («У полі вярба»), *«зачапіўшыся ІІ За сасновы грэбень, ІІ Калышацца сіняе неба...»* («Казка пра Музыку»), *«Зара на куросаднях ціха ІІ Збіраецца ўжо начаваць»* («Шкада мне знаёмых аселіц...») і інш.

Аналізуючы мастацкія пошукі М. Танка ў артыкуле «На раздарожжы», заходнебеларускі крытык С. Каліна, несумненна, меў падставы адзначыць: «Асабліва вялікую ўвагу зьвяртае паэт на вобразнасьць і пластычнасьць сваей творчасьці, якія асягівае пры помачы сьмелай і сконкрэтызаванай мэтафорычнасьці паэтыцкага языка. У сувязі з гэтым творы ягоныя прамаўляюць да чытача перадусім сакавітымі й пукатымі абразамі, моцна насычанымі шчырым і глыбокім лірызмам» (Каліна 1938, 147). Блізкія назіранні знаходзім і ў некаторых іншых крытыкаў, напрыклад Атоса. Унутрана палемізуючы з С Калінам адносна асаблівасцей развіцця творчай індывідуальнасці М. Танка, у артыкуле пад назвай «На ўласны шлях!» ён тым не менш падкрэсліваў наступнае: «Характер паэзіі Танка прыпамінае стыль барока. Бо-ж і там - такая-ж пышнасьць і багацьце формаў. І там - кожная дэталь у будоўлі, разьбе, малюнку створана так, як творацца мэтафары ў радкох Танкавых вершаў. І там - у пэўнай меры стыхійнасьць у тварэньні, якая ў выраслым з барока стылю ракоко дае папросту оргію формаў і матываў: гэткае тамака мноства іх, гэткія яны віхрыстыя, неспакойныя» (Атос 1938, 36).

Натуральна, М. Танк звяртаўся да вобразаў вясны, сонца, навальніцы, пажару, трывала ўгнездаваных у мастацкай практыцы паэтаў-рамантыкаў. Яго ўмоўна-рамантычныя, сімваліка-алегарычныя вобразы і малюнкі неслі сацыяльную праўду жыцця, насычаліся цяжкімі пластамі заходнебеларускай рэчаіснасці, фактамі падпольніцкай дзейнасці лірычнага героя, грунтаваліся

на ідэі непрыняцця прыгнёту і несправядлівасці. Яны падпарадкоўваліся высокаму духоўна-маральнаму ідэалу паэта, асаблівасцям яго вострага асацыятыўна-метафарычнага светабачання, раскаванасці мастацкага мыслення, разняволенасці і нязмушанасці вершаванага радка: *«Цягнуцца думы барознамі, ІІ Чорны змываючы пот»* («Палавічнік»), *«будуць вашы дзеці ІІ Араць бяду з пракляццем на шнурах», «Нехта з песняй залатым скрабе нарогам ІІ Грудзі чорныя, ўраджайныя зямлі», «Змоўкла песня, ІІ топькі звоняць недзе слёзы ІІ На палетках за скрыпучаю сахой»* («Сказ пра Вяля»), *«Думы, як пояс сівых жуpавоў»* («Ноччу»), у батрацкага сына багацця: *«душа пад кашуляй, ІІ Сілы поўная буйнай»* («Ой, калышацца вецер»), *«Прынясём саломы ІІ І падпалім неба, ІІ - Хай расчэша хмары ІІ Пеўня алы грэбень...»* («Скіну з плеч шырокіх»), *«Колас, горам наліваны»* («Каб хутчэй»), *«І сутарэнняў бяду ІІ Зможам грудзьмі маладымі»,* *« Толькі ад песні ў грудзях ІІ Быццам прачнулася сонца»* («На задворках»), *«Даўно ў шалёным карнавале ІІ Зямля трывожная гучыць. ІІ Хутчэй давайце, скрыпачы, ІІ Чырвоны гром сваім цымбалам!»* («Такая лютая зіма!..») і інш.

Лірычны герой паэта ўяўляў сабою не звычайнага чалавека, а ўсемагутнага чарадзея, былiннага волата, пад перазвон смеху якога, паводле яго слоў, *«Нават цяжка смяяцца, скакаць, ІІ - Толькі сыпацца шыбам акон ІІ І слупам ліхтары калыхаць...»,* якi вясновым вечарам *«чупрынай сем зор залатых ІІ На далоні мазольныя змёў»* («Думаў: сёння прайду сабе так...»). *«Стазвонная ліра ў мяне, ІІ Пясняр я, баян-чарадзей,* - прызнаваўся ён у вершы «Вячэрняе люстра вады...», - *Шапнуць бы закляцце струне, // - Збудзіць бы мінулага дзень...».* Лірычны герой М. Танка плыў «Г7а *казачным царстве... ІІ Русалак, праяў, лесуноў»,* бачыў, як у *«тоні рачной сіняву // Атрос Млечны Шлях светлякоў»,* як над вадою *«халадок мапады ІІ Ўзмахнуў вераснёвым крылом».* Яму хацелася збудзіць *«тады чары балот, ІІ Калі тут агні замігцяць, ІІ Каб, вывеўшы свой карагод, ІІ Не мог вадзянік рагатаць»* (Танк 1978, 349).

Ідучы ў задуме *«сярод ніў неабсяжных, шырокіх»,* тонка адчуваючы, як *«Лірыкай восені дыхаюць далі»,* ён абвострана рэагаваў на адлёт птушак у вырай, прысумлена слухаў, як *«звініць у блакіце высокім ІІ Сівое птушынае пер'е»* («Выраі»). Зусім зразумела, што яго вабілі вышыня, прастор, воля, нездарма ён захоплена ўсклікаў: *«Следам глядзіш - столькі ў крылах свабоды!»* (Танк 1978, 235).

Лірычны герой М. Танка, вязень *«цэлі астрожнай»,* імкнуўся *«Песню падрыхтаваць, ІІ Каб было з чым на барознах ІІ Вырай страчаць»* («Сцены і неба кавалак між кратаў...»). Ён не меў *«сціла і паперы»,* дык песні пісаў *«на маўклівых мурах», «на калючых дратах, ІІ На хмарах, што па-над турмой ІІ Прылятаюць»* (Танк 1978, 58). Яго песні-сны блудзілі *«Між дарог чужых, ІІ Між муроў і крат, ІІ Між дратоў стальных»,* дзе ім было *«Душна, цесна»,* благотна-цяжка («Ці падуць калі...»). Яны рваліся *«ўдаль, ІІ Ўдальна волю з пут», «Полымем сваім»* палілі ланцугі, будзілі, клікалі *«на шляхі»* прыгнечаных і абяздоленых (Танк 1978, 73). Адчуваючы сябе сябрам ветра *«сонечнага краю»,* ветра *«ніваў веснавых»,* лірычны герой паэта цікавіўся ў яго, пра што ён спявае ля яго *«астрожных крат», «ці хутка ўдарыць ІІ Гром расплаты над зямлёй»,* калі яны ўрэшце змогуць сустрэцца і шчасліва абняцца («Вецер сонечнага краю...»). З падобным пытаннем звяртаўся ён і да лясной зязюлі, якая *«на лістах рабой бярозкі Камусьці»* лічыла *«шэрыя гады»: «Скажы мне, выражбітка баравая, // Мо чула дзе ці, можа, знаеш ты: // Калі да нас свабода завітае, // Калі з астрогаў вернуцца браты?»* (Танк 1978, 96).

М. Танк стварыў рамантычна-ідэалізаваны вобраз лірычнага героя, цалкам звернутага да высокага духоўна-эстэтычнага ідэалу, скіраванага ў будучыню роднага краю. Гэта вобраз маладога падпольшчыка-рэвалюцыянера, прыгожага сваёй высакароднай ахвярнасцю змагара за інтарэсы

народа, шырокай працоўнай грамады. Ён падвяргаў сумненню маральна-прававую практыку, сацыяльна-эканамічныя асновы заходнебеларускай рэчаіснасці, ставіў на мэце пераўзнавіць іх у адпаведнасці з сацыялістычнымі ідэйнымі прынцыпамі і каштоўнасцямі.

Лірычны герой паэта - асоба падкрэслена мэтаімкнёная і пошукавая, справядлівая і прынцыповая, смелая і рашучая і ў той жа час - сціплая, чулая, даверлівая, высакародная. Гэта чалавек духоўна багаты, узвышаны, летуценны, які адмаўляў свет прыгнёту і насілля, намагаўся выйсці за межы сістэмы ўсталяваных акалічнасцей, каардынат і крытэрыяў, працаваў на далёкасяжную перспектыву. Ён спалучаў «перадавыя палітычныя погляды і тонкую ўражлівасць, - падкрэсліваў У. Калеснік, - рэдкасную маральную чысціню і шырокую натуру. Сувязь яго з жыццём шматгранная, а самавыяўленне інтэнсіўнае, змястоўнае і прыгожае» (Калеснік 1976, 134-135). Маючы дастаткова ўмоўны, абагульнены характар, лірычны герой М. Танка ў той жа час быў цесна звязаны з асаблівасцямі жыцця паэта, шырокім спектрам падзей і фактаў заходнебеларускай рэчаіснасці. Абставіны знешняга свету неслі яму шмат нягод і выпрабаванняў, яго неаднойчы *«адрывалі ад сасонак і ціхіх бяроз, ад вазёрных успеняных хваляў, ад сялянскіх дарог і палос»: «Каласы мае град няраз выбіў, і на помач прыйсьці я ня мог...»*. Аднак, паспяхова пераадольваючы іх, ён няўхільна рухаўся наперад, імкнуўся *«аб чорныя скібы»* народнага жыцця адвастрыць *«новых песьняў нарог»* (Танк 1937, 6).

Паэзія М. Танка вызначалася чысцінёй і свежасцю, непасрэднасцю ўспрыняцця свету, гуманістычна-чалавечай чуйнасцю, але ў той жа час і ўнутранай адмабілізаванасцю, грамадзянскай страснасцю, своеасаблівым драматычна-аптымістычным характарам мастацкага абагульнення. Гэта была паэзія чорных скіб, як падкрэсліваў М. Арочка, «шурпатых далоняў, незагойных ран, стогнаў у катоўнях» (Арочка 1984, 63), гневу і бунту, смелага выкліку, якая грунтавалася на тонкай назіральнасці і ўражлівасці, эмацыянальна-псіхалагічнай пранікнёнасці лірычнага героя, услаўленні высокіх праяў святла і красы ў прыродным свеце, грамадскім асяроддзі і душы чалавека. Характэрная летуценнасць, умоўна-рамантычная мройлівасць, душэўная высакароднасць спалучаліся ў ёй з наступальнай бескампраміснасцю, рэвалюцыйным гартам, ахвярнай мужнасцю. З асаблівай выразнасцю гэта раскрылася ў вершах «Чорныя скібы», «Начная цішыня», «Спатканне», «Над Прыпяццю», «Песня кулікоў», «Паслухайце, вясна ідзе...» і інш.

Вялікае месца ў паэзіі М. Танка належала такім ёмістым сацыяльна-маральным катэгорыям, як матчына песня, родныя загоны, муры і краты, вясна-перамога, звон кайданаў, чорныя скібы, паднебныя шляхі, каласістае гора, жалезны вырай, этапныя дарогі, світальная зара, полымя волі, сталёвы сонечны паход і інш. Яны ўвасаблялі адметныя рысы грамадскага жыцця і прыродна-геаграфічнага ландшафту Заходняй Беларусі, ладу мыслення і філасофіі, духоўна-сацыяльнай свядомасці яе народа, раскрывалі характэрныя асаблівасці беларускага нацыянальнага лёсу. Гэта былі своеасаблівыя каардынаты прыгнечанага і занядбанага роднага краю паэта, у кантэксце якіх і разгортвалася жыццядзейнасць яго лірычнага героя.

Вастрыня грамадска-сацыяльнага светаадчування, вышыня духоўна-эстэтычнага ідэалу абумоўлівалі развіццё характэрных асаблівасцей паэзіі М. Танка, вялі да скандэнсаванасці мастацкага мыслення, інтэнсіўнасці маральнага перажывання, актыўных пошукаў у галіне паэтыкі. Яго вершам была ўласціва заангажаванасць у самыя вострыя праблемы і супярэчнасці заходнебеларускай рэчаіснасці, падкрэсленая драматычная напружанасць зместу, эмацыянальна-пачуццёвая насычанасць, прамоўніцка-публіцыстычны пафас, унутраная палемічнасць. Асабістае, уласна перажытае М. Танк удала спалучаў з грамадска значным, з яркай і пераканаўчай сацыяльнай фактурай, мінулае і сучаснае ў яго суадносіліся з будучым, мара паяднОў-

валася з рэальнасцю, дынамічная, экспрэсіўная думка - з выразнай, пластычнай эмоцыяй. Несумненна, якраз гэтыя якасці забяспечвалі вядомасць і папулярнасць вершаў паэта ў шырокім грамадскім асяроддзі.

Паэзія Максіма Танка - надзвычай яркая і арыгінальная з'ява ў гісторыі літаратуры Заходняй Беларусі. Будучы глыбока заангажаванай у нацыянальна-вызваленчы рух, яна раскрыла вызначальныя асаблівасці народнай самасвядомасці, шырокага грамадска-сацыяльнага асяроддзя, засведчыла паўнату і натуральнасць адчування жыцця. Далейшыя духоўна-мастацкія пошукі паэта будуць развівацца ў савецкі перыяд, калі яго яркі і самабытны талент разгорнецца на поўную сілу.

ЛІТАРАТУРА

Гніламёдаў У. Класікі і сучаснікі: Артыкулы, нарысы, старонкі ўспамінаў. Мн., 1987.
Танк М. Збор твораў: У 6т. Мн., 1978. Т. 1. Калiна С. На раздарожжы // Калосьсе. 1938. Кн. 3.
Атос. На ўласны шлях! // Беларускі летапіс. 1938. № 2. С 36-38.
Калеснік У. Яго чалавечнасць // Пра таварышаў па пяру: Зборнік крытычных артыкулаў. Мн., 1976.
Танк М. Журавінавы цьвет. Вільня, 1937. Арочка
М. Максім Танк: Жыццё ўпаэзіі. Мн., 1984.

Паступіў у рэдакцыю 27.04.06.

***Мікалай Уладзіміравіч Мікуліч*** - кандыдат філалагічных навук, дацэнт, в. а. вучонага сакратара Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі.